

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў КАЛІЙНАЕ РАДОВІШЧА

МС

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАННЯ НА ТЫДЗЕНЬ



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

24 МАЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 95 (28962)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**
*«У Беларусі актыўна рэалізоўваюцца праекты па захаванні і эфектыўным выкарыстанні аб'ектаў Сусветнай культурнай спадчыны, вывучэнні і структураванні архіваў і бібліятэчных калекцый, стварэнні каталогаў і аблічбоўцы ўнікальных друкаваных матэрыялаў. Беларусь прадстаўлена ва ўсіх спісах спадчыны ЮНЕСКА. Мы па праве ганарымся тым, што на тэрыторыі нашай краіны знаходзяцца чатыры аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА: Белавежская пушча, геадэзічная Дуга Струвэ, замкавы комплекс «Мір» і палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы. Гэтыя аб'екты — важкі ўклад краіны ў сусветную скарбніцу. Яны ўяўляюць каласальную цікавасць для даследчыкаў і шырокай грамадскасці».*

# ПАЭТЫЧНАЕ СЭЛФІ



З наступленнем вясенне-летняга сезона ў Навагрудку, як заўсёды, чакаецца турыстычны бум. Кожны наведвальнік першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, акрамя руін сярэдневечнага замка, касцёлаў і царквы, забудовы рынкавай плошчы, імкнецца ўбачыць «разыначку» горада — Дом-музей Адама Міцкевіча — і зрабіць сэлфі на фоне бюста геніяльнага паэта.
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## КОРАТКА

• Стыпендыі спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў будзе атрымліваць 191 чалавек.

• **Беларусь і КНР падпісалі пагадненне аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі і вучоных ступенях.**

• Інавацыйны беларуска-расійскі ліфт прэзентавалі ў Маскве.



• **Каля чатырох тысяч ваеннаслужачых у складзе пешых парадных разлікаў прымуць удзел у парадзе 3 ліпеня.**

• Стваральнікі валошкавага марожанага шукаюць дзяўчыну, якой падораць мільён блакітных кветак.

ISSN 1990 - 763X

Форум

## НА КАРЫСЦЬ ЖУРНАЛІСТЫКІ ПРАЎДЫ

### Медыяфорум: клопат пра журналістаў, запатрабаванасць аналітыкі і змаганне за абмежаваны рэсурс

**Учора ў Брэсце распачаў работу XIV Беларускі міжнародны медыяфорум. Ён носіць назву «Партнёрства ў імя будучыні: журналістыка і сацыяльная абарона грамадства».**
**Тут вядуцца размовы пра новую рэальнасць медыяпрасторы, пра тое, як канкурыраваць (і ці патрэбна?) з сацыяльнымі сеткамі, пра якасную журналістыку і інфармацыйны шум. Эксперты не толькі з Беларусі, але і з Украіны, Расіі, Ізраіля, Эстоніі, Таджыкістана, Узбекістана, Туркменістана, Сербіі і іншых краін дзеляцца сваім прафесійным бачаннем.**

СТАР. 3



Фота БелТА.

Спецыяльны рэпартаж

## «ДА НАРКОТЫКАЎ НЕ ВЯРНУСЯ»

**У папраўчай калоніі № 22 адбываюць пакаранні мужчыны, упершыню асуджаныя за незаконны абарот наркотыкаў (артыкул 328 КК Беларусі). Турму пад Івацэвічамі ў народзе называюць «Воўчыя норы» — па вёсцы, якую спалілі падчас вайны. Дарога ва ўстанову ляжыць цераз лес, найбліжэйшыя населеныя пункты — Даманава і Боркі — за 9 кіламетраў. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў калоніі і паглядзелі, як жывуць тыя, хто аднойчы пераступіў закон.**

* * *

— Тут я ўжо прыкладна год і сем месяцаў, — знаёмімся з Уладзімірам Стадольнікам.

— Прыкладна?

— У мяне вялікі тэрмін, 12 гадоў, — лічыць па днях бессэнсоўна. Я сам не наркаман і нават ніколі не спрабаваў. У турму трапіў за перавоз кантрабанды. Вага грузу сур'ёзная — 75 кілаграмаў, — згадвае 51-гадовы мужчына. — Амаль тры разы быў жанаты. Апошні проста не паспеў! Планавалі распісацца ў чэрвені, а ў сакавіку мяне «ўзялі».

На пытанне, што падштурхнула парушыць закон, мужчына адказвае неахвотна:

— Раскайваюся. Але навошта зараз шукаць прычыны? Усё роўна нічога не зменіць, — замаўкае. — Матуля і сын — самыя блізкія людзі. Яны не адвярнуліся ад мяне, прабачылі. Падтрымка на зоне патрэбная як паветра.

СТАР. 4